Учреждение образования
«Пинский государственный высший банковский колледж
Национального банка Республики Беларусь»

# Педагогический опыт

## Методический сборник

Выпуск V

Пинск 2005

УДК 378.147
ББК 74.26
П24

С о с т а в и т е л и :
*Е.В.Куделич, А.Ф.Кудренок*

П о д р е д а к ц и е й *Голубева С.Г., профессора, доктора экономических наук*

Р е к о м е н д о в а н о *Научно-методическим советом колледжа*

Оригинал-макет данного издания является собственностью Пинского государственного ВБК и его воспроизведение любым способом без согласия редактора не разрешается.

УДК 378.147
ББК 74.26
П24

Методический сборник

**ПЕДАГОГИЧЕСКИЙ ОПЫТ**

Выпуск V

Ответственный за выпуск П.С.Кравцов

Подписано в печать 28.04.2005 Усл. печ. л. 8,60. Уч.-изд. л. 7,17.
Тираж 100 экз.
Отпечатано на ризографе
Учреждение образования «Пинский государственный высший банковский колледж Национального банка Республики Беларусь»
225710, Пинск, ул. Днепровской Флотилии, 23

*Місюкавец Л.П.*
*выкладчык кафедры моўнай падрыхтоўкі*

## Метадычная распрацоўка літаратурна—краязнаўчага вечара «СМЕРЦІ Ў ПАЭТА НЯМА — ЁСЦЬ НАРАДЖЭННЕ»

*«У кожнага ёсць свой мілы сэрцу куток зямлі...*
*Куток гэты — тая хата, дзе мы вучыліся хадзіць, дзе чулі цеплыню матчыных рук і матчынага сэрца, куток нашага маленства...Сярод іншых дарагіх, хвалюючых успамінаў - ён самы дарагі, самы шчымлівы .»*
*І.Мележ*

Арганізацыя вечара спецыяльнай методыкі не мае. Каб падрыхтаваць краязнаўчы вечар, як і любы іншы, выкладчык разам з навучэнцамі выбірае тэму, акрэслівае мэты, вырашае, у якой форме яго мэтазгодней правесці, стварае ініцыятыўную групу і размяркоўвае індывідуальныя даручэнні. Таксама калектыўна распрацоўваецца сцэнарый вечара і яго афармленне. Пад кіраўніцтвам выкладчыка навучэнцы вучацца выразна чытаць творы, рыхтуюць сольныя выступленні і г.д.

Гэты літаратурна-краязнаўчы вечар прысвечаны нашай слаўнай зямлячцы, вядомай беларускай паэтэсе Яўгеніі Янішчыц.

Творчасць мастака нельга разглядаць у адрыве ад яго асяроддзя, дзе ён нарадзіўся, жыў, бо яно накладвае пэўны адбітак на яго светаўспрыманне, узбагачае жыццёвым вопытам і з'яўляецца патэнцыяльным матэрыялам для будучых твораў. Вопыт паказвае, што калі навучэнцы знаёмяцца з фактамі жыцця і творчасці пісьменніка ў родных яго мясцінах, калі глыбей вывучаюць тое асяроддзе, якое жывіла яго талент, то асоба мастака слова, пафас яго творчасці ўсведамляюцца імі не проста паўней і глыбей, але і эмацыянальней. Веды, сагрэтыя сэрцам, аказваюць больш выхаваўчы ўплыў на навучэнцаў, а таксама узмацняецца годнасць за беларускую зямлю.

Але, як мы вырашылі з навучэнцамі, паглядзець дзе расла, вучылася паэтэса, сустрэцца з яе аднавяскоўцамі, — гэтага мала.

З'явілася думка: напісаць літаратурна-музычную кампазіцыю і паехаць на радзіму паэтэсы з канцэртам. Ахапіць усе тэмы творчасці паэтэсы за адну-дзве гадзіны вельмі складана. Таму вырашылі ўзяць творчасць паэтэсы, звязаную з родным краем, яго людзьмі, з асабістым жыццём паэтэсы.

Перад тым, як пісаць кампазіцыю, сустрэліся з кіраўніком музея "Я.Янішчыц", з работнікам клуба в.Велясніца, папрасілі дапамагчы ў афармленні залы, у арганізацыі сустрэчы з настаўікамі Я.Янішчыц, вяскоўцамі, у правядзенні экскурсіі па родных мясцінах паэтэсы. Пасля

таго як было дамоўлена аб вышэй сказаным, навучэнцы атрымалі індывідуальныя заданні:

1) падабраць лепшыя творы аб блізкіх для яе сэрца людзях, аб родным краі, мясцінах паэтэсы, яе аднавяскоўцах;
2) успаміны пісьменнікаў аб творчасці і жыцці Я.Янішчыц;
3) вершы, прысвечаныя паэтэсе;
4) крытычныя артыкулы аб яе творчасці;
5) песні, напісаныя на словы Я.Янішчыц.

Шукаючы і адбіраючы патрэбны матэрыял, навучэнцы пазнаеміліся з усімі зборнікамі Я.Янішчыц. Прачыталі аб значэнні яе творчасці ў беларускай літаратуры, аб актыўным грамадскім жыцці і ў той жа час нешчаслівым асабістым лесе. Ведаючы ўсё гэта, навучэнцы не маглі дачакацца той хвіліны, каб паехаць у в.Велясніца і сваімі вачыма ўбачыць апісаныя ў творах мясціны і аднавяскоўцаў паэтэсы.

Для правядзення вечара выбралі двух вядучых, якія на працягу кампазіцыі знаёмяць з асноўнымі датамі і падзеямі жыцця Я.Янішчыц .

І вось 25 лістапада навучэнцы прыязджаюць у в.Велясніца. Нас сустракае сакратар сельскага савета Крышталь В.П. і вядзе да дома, дзе расла паэтэса. Мы даведаліся, што нарадзілася яна ў суседняй в.Рудка, але пазней бацькі пераехалі ў в.Велясніца, дзе скончыла 6 класаў. Разам з Яўгеніяй гадаваўся і брат, які жыве па сеняшні дзень у весцы.

Пасля таго, як Яўгенія трагічна загінула, маці яе паехала ў Мінск, каб гадаваць далей яе сына. Таму ў доме зараз жыве іншая сям'я. Перад домам пасаджаны кветкі, вісіць мемарыяльная дошка.

Навучэнцы ўзлажылі кветкі і на памяць зрабілі фотаздымак.

Пабывалі ў школе, дзе вучылася Я.Янішчыц. Затым прыйшлі ў вясковы клуб. На сценах віселі вялікія плакаты з прыродай роднага краю і словамі паэтэсы аб ім, зроблена выстаўка кніг, на сцэне стаяў вялікі партрэт Я.Янішцыц.

З вялікай адказнасцю, з душэўнай цеплыней чыталі творы паэтэсы навучэнцы. Здавалася, што дзесьці ў зале прысутнічае сама Я.Янішчыц.

Вельмі прыемна было слухаць нам падзяку настаўнікаў школы, мясцовых жыхароў, работнікаў клуба аб тым, што мы помнім сваю зямлячку, шануем памяць аб ей, а значыць і шануем зямлю беларускую, яе дастойных людзей.

Калі няма магчымасці паехаць у родныя мясціны Я.Янішчыц, можна правесці завочную экскурсію з навучэнцамі.

## Сцэнарый вечара

*Гучыць мелодыя песні «Зямля мая», муз. Л.Захлеунага, сл. У.Някляева, музыка сціхае.*

**Вядучы 1.**

Яугенія Янішчыц...Прыродны паэтычны дар. І цяжкая жыццёвая дарога. Вялікая творчая ўдача, высокі лірычны ўзлёт. І глыбокая

асабістая драма — трагічны зыход. Месяц з'яўлення — лістапад. І месяц знікнення — лістапад. Паміж днём народзінаў і трагічнаю датаю — сорак гадоў, толькі сорак.

Паўстаў надмагільны помнік — прыгожая постаць з крыламі за спіною. Таленавіты скульптар Леў Гумілеўскі зрокам мастака бачыў крылы яе натхненасці? Ці ён іх чуў у руках узвышанай душы? А ці адчуў «вечную прагу крыла» ў асобе ўзнеслай паэткі? Як бы ні было, крылы — уласцівы яе паэзіі вобраз, які ўжываўся ёю ў самых розных, самых нечаканых кантэкстах. Скажам вось у такіх:

*Але гудзе любові крылле:*
*Шчаслівы славячы прылёт,*
*Жыццё мае, і там, на схіле,*
*Ты ўсё — загадкавы палёт.*

Чаму ж яны, богам дадзеныя крылы, не ўтрымалі яе аднойчы над халоднаю скамянелаю зямлёю?

**Вядучы 2.**

Здарылася страшная несправядлівасць: у сівой матулі не стала любай дачкі, яна павінна была б даглядзець яе старасць - асірацела маці, у сына-школьніка не стала матулі, якая яго «ахоўнай арліцай была», у паэзіі не стала самаадданай майстрыцы, якая ўмела «з нябачных промняў вобраз ткаць», у народа не стала вернай дачкі-патрыёткі, якая падаравала яму «зорную тэму», зорную сваю паэзію.

Усім, хто любіў і шкадаваў яе, журыцца па ёй, застаецца суцяшэнне: духоўная энергія Я.Янішчыц, што засталася ў яе спадчыне, непадуладная нябыту.

Смерці ў паэта няма — есць нараджэнне.

Сеняшні вечар мы прысвячаем памяці Я.Янішчыц.

***Чытальнік 1:***

***Верш «Добры вечар, землякі!»***

*Як жывецца без мяне,*
*Сонейка — крылацейка?*
*А ў палескай старане*
*Кожны сокал - брацейка.*
*Назбірала мех грахоў*
*Ды ў расу абулася.*
*Колькі зведала шляхоў –*
*Гэтак мне не чулася. ...*
*Добры вечар, землякі!*
*Добры вечар, зелена!*
*Тут пазвоньваюць вякі*
*Нібы мак даспелены.*
*Паўнагрудая кума*
*Празвініць абцасамі*
*Тут прыдуман нездарма*
*Танец з выхілясамі.*

*Рукавочкам — да рукі,*
*Паяском — да пояса.*
*З вамі разам, землякі,*
*І ў зямлі не боязна!*

***Успаміны настаўніка, які вучыў Я.Янішчыц* — Грэчка Аркадзя Міронавіча.**

Жыцце Я.Янішчыц пачалося на вясковым улонні. Нарадзілася яна ў в.Рудка Пінскага раёна 20 лістапада 1948 г. у звычайнай сялянскай сям'і. Нічым спачатку не адметная ад сваіх аднагодкаў: тоненькая, як бярозка, светлавалосая, яна гуляла, дапамагала бацькам па гаспадарцы, вучылася ў школе. Да 7-га класа яна вучылася ў Мерчыцкай сямігодцы. Адкрыцце яе таленту адбылося ў 7 класе, калі яна сама напісала некалькі вершаў для сценгазеты. Затым вершы былі надрукаваны ў нашай раённай газеце «Палеская праўда».

Я быў яе настаунікам па беларускай мове і літаратуры, а таксама быў дырэктарам Мерчыцкай сямігодкі. Ва ўсіх мерапрыемствах Жэня была вельмі актыўная. Ужо ў тыя гады мы, ўсе настаўікі, прыкмецілі, што дзяўчына нейкая асаблівая: задумлівая, яе цягне да прыроды, вельмі паслухмяная. Вучні ў класе неяк групаваліся вакол яе, яна для іх была як быццам магнітам. У яе першым паэтычным сшытку, што яна мне калісьці ў 7 класе паказала, былі вершы пра маці, пра нашу прыгожую прыроду, пра сваіх сябровак, пра настаўнікаў.

Затым яна ў 8 клас пайшла вучыцца ў Парэцкую школу, там яна пачала друкаваць свае вершы ў рэспубліканскім друку:

*Тут, дзе хапае да хлеба і солі*
*І на сталах не канчаецца мед.*
*Тут, дзе не скончыцца песня ніколі*
*І не ўпадзе на калені народ!*

Гэтыя цудоўныя радкі з яе верша “Тут”, які быў надрукаваны ў зборніку “Каліна зімы” ў 1987г.

Яркай каметай пранеслася яна па высокаму небу беларускай паэзіі, асвятляючы яго і астаўляючы пасля сябе такі след, што доўга яшчэ будзем мы ўсе адчуваць яго і бачыць, будзем чуць яе голас празрыстай палескай крыніцы.

**Вядучы 1.**

Паэты з'яўляюцца нечакана. Невядомае імя Жэня Янішчыц пракінулася на старонках рэспубліканскага друку недзе ў сярэдзіне шасцідзесятых, разам з імёнамі Алеся Разанава, Г. Бураўкіна, Р. Барадуліна і г.д. А ў 1970 г. выходзіць яе першы зборнік «Снежныя грамніцы», праз чатыры гады зноў зборнік вершаў «Дзень вечаровы»,за які атрымала ўзнагароду Лаўрэата прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1978г.), потым зборнік вершаў «Ясельда» (1978г.), «На беразе пляча» (1980г.), «Пара любові і жалю» (1983г.), узнагароджана Дзяржаунай прэміяй БССР імя Я.Купалы (1986г.) «Каліна зімы» (1987г.), кніга вершаў і паэм «У шуме

жытняга святла» (1988г.).

З самага пачатку сваёй творчасці Я.Янішчыц была патрабавальна да сябе, як творцы. Вось у пісьме да Васіля Жуковіча яна пісала: «Мне неяк няёмка нават, што ў Мінску мяне лічаць сапраўднай паэтэсай. Часам смешна: я пакуль што настойліва шукаю сябе ў сваіх вершах».

**Вядучы 2.**

Паэзія Я.Янішчыц пачынаецца з любові і захаплення. З любові да свайго краю, у першую чаргу да тых мясцін, у якіх паэтэса нарадзілася і вырасла, да надзвычай блізкіх яе чуламу сэрцу людзей працы, да іх пявучай, мілагучнай мовы.

У размове з журналістам П.Васючэнка, Яўгенія Іосіфауна так сказала аб спецыфіцы авалодання роднай мовай, моўнай культурай народа. «Спецыфіка, гэта, бадай занадта сухаваты тэрмін. Прасцей і дакладней будзе сказаць - жывая, кроўная повязь з усім тым, што фарміруе станаўленне чалавека, яго зрок і душу. Зрэшты мне доліла нарадзіцца ў нялёгкі пасляваенны час. Але душа не магла не адчуць, не запомніць аб'ядноўваючай усіх шчырых людзей дабраты і спагады. Само сабой адбылося, што калі я пачала пісаць вершы, гэтыя самыя розныя і непадобныя людзі і перад вачамі, і мысленна стаялі перада мной. І кожны не толькі сваёй постаццю, сваім аблічам, але перш за ўсё сваім голасам, інтанацыяй, песняй падказваў словы, думкі, пачуцці».

*(Гучыць песня на сл. Я.Янішчыц **"Старана мая азерная"**).*

***Чытальнік 2.***

***Верш "Я вас люблю"***

*«Я вас люблю"- няма каму сказаць?*
*А мне ў любві да скону не змыліцца*
*Я вас люблю, лясы і сенажаць,*
*Старая вёска, новая сталіца.*
*Мы ў сэрцы носім радасць і грахі*
*І распраўляем пераможна крылы.*
*Я вас люблю, айчынныя шляхі,*
*Я помню вас, забытыя магілы!*
*І знаю: дзень пражыты нездарма,*
*Калі пераэкываю і хварэю*
*Калі перад імяннай цяной - сама,*
*Нібы цяна, ад жудасці бялею.*
*Падлесак - сын мне, бор вячысты - друг,*
*Зіма зажурыць - развесяліць лета*
*Цябе люблю, патрыярхальны плуг,*
*Цябе - у страшным космасе, ракета.*
*Люблю я вас, сівыя маціркі,*
*Што аж дагэтуль гояць боль па дзецях*
*Што вы мне ўсе-нібы мацерыкі,*
*Якія хочуць міру на планеце.*

***Чытальнік 3.***

***Верш "Сінін"***

*Тут, дзякуй богу, усе здаровы,*
*Калі прывык хварэць калгас!*
*...На красавіцкі луг карова*
*Вядзе цялятка ў першы клас*
*Дзівуецца зямляк з-за мора*
*На незвычайны ў весцы план*
*Дзе ў кожнай хаце па шасцёра*
*Малых і шустрых сінінчан.*
*А веска з попелу ўваскрэсла -*
*Пад Сінінам Сінін крычыць.*
*Ды за бяседнай чаркай песня*
*Яшчэ з-пад кораня гучыць.*
*Нясе ўчэпіста вядзерца*
*У малой руцэ даярчын сын.*
*...Не прывядзі разбіць мне сэрца*
*Аб немату тваю, Сінін !*

**Вядучы 1.**

Як вядома, жыццё паэтэсы пачалося на вясковым улонні. Каларыт Палесся прайшоў у вершах, дзе можна напаткаць і веску Велясніца, раку Ясельду, Лань.

Але роднае Палессе было непадзельна ад землякоў. Чытаючы зборнік вершаў Я.Янішчыц, сустракаемся з цеткай Клавай, Дзедам Цімай, Усцінаю, цеткай Лідай Саўчуковай і іншыя. Невыпадкова, што прысвяціла яна верш вясковым жанчынам.

***Верш "Балада вернасці"***

*Да вас бяжыць знаемая дарога,*
*Да вас вязу няпэўны свой настрой*
*А вы адкуль з такою дабрыней*
*І да мяне, і да майго малога?*
*Лаўлю ласкавы поціск вашых рук,*
*Што загрубелі ад работы трошкі*
*А ці вядома пачуццё разлук*
*Вас, неразлучным, аж да самай дошкі?*
*Адкуль у вас пагэтулькі святла?...*
*Ды схамянуўся, тут не трэба словы.*
*У маім сяле яшчэ на паўсяла*
*Жывуць з вайной заручаныя ўдовы.*
*І па начах яшчэ ім страшна спаць,*
*Гартаць жыцця пражытыя старонкі.*
*І незваротным промнем зіхаціць*
*На пальцах скамянелыя пярсценкі.*

**Вядучы 2.**

Калі Яугеніі Янішчыц задалі пытанне, што азначае ў Вашым жыцці ваша малая радзіма і як адносяцца ў роднай вашай весцы да вашых твораў, яна адказала так: "Хіба на гэтае пытанне лацвей адказваць мне? Вяскоўцы ведаюць, канешне, мяне і як паэтэсу, але больш успрымаюць, як аднавяскоўку, як чалавека ці проста Жэню. На вачах у многіх я расла і вырасла. Многім адпісвала пісьмы, і таму многія запомнілі мяне як "свайго нязменнага пісара". Шкада толькі, што "Анэткам маім і Анюткам часу нямашка чытаць". Мая маладая радзіма — гэта мой лес, мой боль — мая паэзія."

***Чытальнік 4.***

***"Апавяданне пра жытневы сноп"***

*Як жыцця твайго палова-*
*Выспеў жыта жоўты край*
*Цетка Ліда Саўчукова,*
*Мне на шчасце колас дай..*
*Каб як промень у кватэры,*
*Быў на ўсе мае гады*
*Ад усякае халеры ,*
*Ад усякае бяды.*
*Цётка Ліда сноў калгасных*
*Назбірала мне снапок*
*І тугога перавясла*
*Зацягнула вузялок.*
*"Давязеш? -смяецца ясна*
*Мне суседка на хаду,-*
*Разарвецца перавясла-*
*Так і знай, што на бяду!..*
*Сноп дарогаю даўгою,*
*Нібы сына, везла я,*
*Прытулілася шчакою*
*Да трывалага вузла*
*Цётка Ліда Саўчукова*
*Твой дасціпны жарт нашу*
*І - калі шукаю слова,*
*І - калі яго пішу*
*І калі ў жыццёвай прозе*
*Апускаю рукі ніц,-*
*Голас твой, нібы калоссе,*
*Над сталом маім звініць.*

**Вядучы 1.**

Як у кожнага чалавека, так і ў Я.Янішчыц Радзіма і шчасце будуць няпоўнымі, калі не гаварыць аб самых родных: - бацьках і дзецях. Ні адзін зборнік не выйшаў у свет без вершаў, прысвечаных маці і сыну. Мы не

будзем гаварыць зараз аб эмоцыях паміж дачкой і маці, паміж маці і сынам, а ўважліва ўслухаемся ў словы самой Янішчыц. "Самым моцным уражаннем жыцця, якое пакінула след у маёй паэзіі, з'яуляецца жыццё маёй мамы. Я заўсёды здзўуляюся ашаламляльнай энергіі ў зграбнай, прыгожай ды спрацаванай постаці пад ... 68 гадоў. Яе лес мог бы скласціся зусім іначай, каб не было вайны. Сем класаў польскай школы, скончаных на "выдатна"! Адукаваны і любімы муж, якога фашысты растралялі ў 1944 годзе за сувязь з партызанамі. Цудам ацалела з грудным дзіцём на руках. Нечаканая смерць затраўленага бацькі - майго дзеда. Бескарыслівае служэнне сваім малодшым сёстрам: вывучыліся, дзякуюць ёй. Усё жыццё — праца, карпатлівая і чэсная праца."

*Гучыць музыка песні **"Калыханка маці"**.*

***Чытальнік 5.***

***Верш "Ты вучыла мяне"***

*Ты вучыла мяне сеяць жыта і лён*
*І цярплівасці вечнай - уголас не плакаць.*
*Апынуся калі сярод чорных варон,*
*-Я памру, ды не буду па-іхнаму каркаць.*
*Вось трывожна вядзерца нясу, як тады,*
*Як вучыла, нясу. Я нясу, каб суседка*
*Не сказала, што нават звычайнай вады*
*Прынясці не ўмее, не заліўшы сукенку.*
*Цвёрда мною завучан натруджаны крок*
*Твой, якому навек ўжо не саступіцца*
*І душа мая часта, нібы матылек,*
*На агонь вылятае, ды агню не баіцца.*
*Пішаш: «Век мой пражыты. Наперадзе - твой.*
*За мяне не хвалюйся. Я буду здаровай.*
*Да апошняй вячорнай зары палявой*
*І грыбочка апошняга ў нашай дуброве.»*
*Мама сею не жыта я, сею не лен*
*Але з лёну і жыта я словы складаю*
*І калі ўглядаюся ў парасткі дзен*
*-Чую крокі твае. І свае вымяраю.*

***Чытальнік 6.***

**Верш «Мама»**

*Не, усё-ткі не я: мама мая - паэтэса*
*Са шчымлівай грудною песняй,*
*З клопатамі пявучымі*
*Пра поле, балацявіну;*
*Пра тое, як спорна вучыцца*
*У горадзе меншаму сыну*
*Пра старое гняздо буслішына,*
*Што разбурыў вятрыска. . .*

*Бачу паўстала сціхана*
*З пяцімесячным на руках*
*У скромнай чорнай спадніцы.*
*Маму палохае страх -*
*Як жыць адной маладзіцы.*
*Мільгае за поўнач акно яе, -*
*Удовай не спіцца:*
*Машынка стукоча. І мама пяе,*
*Абшывае сваю Велясніцу:*
*Каму -за пакосы, каму -за каня,*
*Каму -за шчырае дзякуй.*
*Сустракае яна прасветленасць дня*
*Усмешкай - адвыклася плакаць.*
*Позна класціся. Рана ўставаць.*
*Па -над загонамі шчыраваць*
*Па-над калыскай маліцца.*
*У чарадзе праліўных нядзель -*
*Не прапусці грыбочка . . .*
*Кароткі, як шчасце, ухаджаны дзень,*
*Яшчэ карацейшая - ночка.*
*Дыхае вольнымі мама грудзьмі,*
*Калі вяртаемся з поля.*
*Ушчувае: драціну з дарогі здымі -*
*Іншаму ног не паколе.*
*Кажа: ападзіны дол замялі.*
*Выткаўся жнівень раскошны.*
*Здымі сандалікі, не бойся зямлі,*
*Не бойся, дзіцятка, пожні . . .*
*Прыеду. Кветка чакання ў акне*
*Міргае - цвіце ў адзіноце.*
*А вершы баюся чытаць, каб мяне*
*На глухой не злавіла ноце*
*Мама - мая паэтэса.*

***Чытальнік 7.***

**Верш "Брат"**

*Калі акно прасвечваюць зарніцы*
*І град страляе з громам неўпапад,*
*-Няма ў сястры сардэчнае сястрыцы,*
*Есць толькі брат. Названы мною - брат.*
*Самоты гордай скінуўшы карону,*
*Укленчыўшы грашам, як абразам,*
*Я пазваню яму па тэлэфону.*
*Не ен пачуе - і пазвоніць сам.*
*Бог ведае калі наступіць ранак*

*І будзе сэрцу кожны промень рад.*
*А ноч гудзе, і ў зарыве маланак*
*Танюткую рабіну лупіць град.*
*Будуе межы час і крошыць сцены,*
*Каб месцачка было для шчырых свят.*
*Мой дзіўны друг і дар мой неацэнны,*
*Мой чуйны брат. І дзякуй лесу, - брат.*

**Вядучы 2.**

Многа вершаў маці прысвяціла сыну. Але найбольш трывожна, як развітанне з сынам як апошні мацярынскі наказ, поўны пяшчоты і жалю верш "На усякі выпадак". Тут выяўлены высокія маральна - этычныя патрабаванні да сына і перш за ўсе - адказнасць за даручаную справу, душэунай шчодрасці, сумленнасці, вернасці ў сяброўстве, уменне адстойваць свае прынцыпы.

***Чытальнік 8.***

***.Верш "На ўсякі выпадак"***

*Сын , як заўседы,*
*Акуратна рабі ўрокі :*
*Дысцыпліна - харошая якасць*
*Не толькі поспеху ў школе.*
*Сынок як і ўчора*
*Паслужы няўцешным суседзям ,*
*Адзіны сын у каторых*
*Нечакана загінуў ад кулі*
*На суровым полі заслоны!*
*Сыночак, чэсна, бы ўчора,*
*Прынось грашовую здачу*
*З прадуктовага магазіна.*
*Ды, на ўсякі выпадак,*
*Умей даць здачы*
*Подласці і няпраўдзе!*
*І яшчэ: будзь прывязан,*
*Як можаш, да верных сяброў па сэрцу*
*( Не дай табе божа мяняць іх на новых! ),*
*Бо можа так здарыцца,*
*Што заутра -*
*Не выйду табе на сустрэчу .*

*Мама.*

**Вядучы 2.**

Як мы ўжо гаварылі, паэзія паэтэсы пачынаецца з любві і захаплення. Яшчэ з самых першых вершаў загучала ў яе і тэма кахання. Душэўная далікатнасць жанчыны, багацце яе эмоцый, яе чуласць не толькі да свайго брата, але і да чужога болю, самаадданасць і высакародства ў каханні, вастрыня рэакцыі на самыя тонкія нюансы пачуццяў і мноства

іншых праяў сардэчнага жыцця пранікнена адлюстраваны ў этычнай лірыцы паэтэсы.

***Чытальнік 9.***

***Верш «Застаюся каханай»***

*Страшна ўвечары жыць*
*З незагоенай ранай*
*Ты сказаў : "Адбаліць,*
*Заставайся каханай ".*
*Страшна ноччу мне быць*
*З гаркатой апантанай .*
*Ты сказаў : "Адшчыміць,*
*Заставайся каханай ".*
*Ах , нуда - не бяда*
*У цішыні расстралянай.*
*На праломе ільда*
*Застаюся каханай.*
*Валуны ды вуглы ,*
*Даль дарогі калянай.*
*У праеме імглы*
*Застаюся каханай !*

***Чытальнік 10.***

***Верш "Пакліч мяне"***

Ты пакліч мяне. Пазаві.
Там заблудзішся ў хмельных травах.
Пачынаецца ўсё з любві,
Нават самая простая ява.
І тады душой не крыві
На дарозе жыцця шырокай.
Пачынаецца ўсё з любві —
Першы поспех і першыя кропкі.
Прыручаюцца салаўі
І змяняюцца краявіды.
Пачынаецца ўсё з любві —
Нават ненавісць і агіда...
Ты пакліч мяне. Пазаві.
Сто дарог за маімі плячыма
Пачынаецца ўсё з любві,
А інакш і жыць не магчыма.

**Вядучы 1.**

З вершаў Я.Янішчыц паўстае ўнутраны свет сучаснай жанчыны, яе любоў да жыцця, працавітасць, шчасце мацярынства, хараство і дабрыня. Такое застаецца назаўседы ў нашай памяці паважаная паляшучка, або як яна называла сябе ў пісьме да В.Жуковіча — «Ясельдзянка» Я.Янішчыц.

Яна жыве не толькі у нашай памяці, але і у памяці вядомых беларускіх паэтау.

***Верш «Памяці Я.Янішчыц»***

*Трагедый зямных спасціжэнне*
*На хвалі скразной глухаты.*
*Як чорна і пуста мне, Жэня.*
*Душа захлынаецца —*
*Ты! ...*
*Абудзяцца сны снегавыя*
*У далечы дня агнявой,*
*Я нес табе кветкі ...*
*Жывыя.*
*Астатнія кветкі ...*
*Жывой.*
*Забыта, нішто не падскажа,*
*Ляжалі яны, гваздзікі.*
*Сукенка — прачорная сажа!*
*І позірк цягучы, гняткі.*
*Згадау — і душа схаладзела*
*На ўскраі жахотнай бяды.*
*З якой ты далечы глядзела*
*І сумам гукала — куды?*
*На скрытнай астатнай дарозе*
*Віпіліся душамі мы.*
*Зардзела ярчэй на марозе.*

**Вядучы 2.**

Гэтымі словамі мы закончым сённяшнюю нашу сустрэчу. Вялікае дзякуй усім, хто дапамог нам убачыць і адчуць цеплыню роднага краю, вачамі Я.Янішчыц.

# СОДЕРЖАНИЕ

## ВВЕДЕНИЕ


*ГОЛУБЕВ С.Г.* Подготовка банковских специалистов на Полесье: опыт, задачи, перспективы 4


## I ПРИЕМЫ ОБУЧЕНИЯ: МЕТОДИКА И ОПЫТ


*КУДЕЛИЧ Е.В.* Роль и место учебно-методического отдела в организации методической работы в колледже 8

*НЕСТЕРЕНКО Е.К.* Роль кафедры специальных банковских дисциплин в управлении учебным процессом 12

*ВОЛОДЬКО О.В.* Научно-исследовательская работа студентов на кафедре экономики и управления 16

*ГРАБАР Р.Н.* Особенности преподавания в колледже 18

*МИСЮКОВЕЦ Л.П.* Роль педагогического общения в профессиональной компетентности преподавателя 24

*ЛЯГУСКАЯ Н.В.* Проблемы и тенденции профессиональной подготовки банковских служащих 28

*КУДРЕНОК А.Ф.* Международная деятельность колледжа 31

*ЧЕРНОРУК С.В.* Развитие ведущих учебных умений и мотиваций как путь к личностному росту 35

*ВОЛОДЬКО О.В.* Курсовая работа как вид учебной деятельности 41

*ГОРЕГЛЯД С.Г.* Индивидуальные и групповые консультации как форма заочного обучения 48

*ЛАВРУЩИК В.Н.* Стратегия успеха 52

*ДЫДЫШКО Р.И.* Проектная методика на занятиях иностранного языка 56

*ЕВЧИК В.Ф.* Использование элементов модульной технологии и рейтинговой оценки знаний при дифференциации в обучении по курсу «Математическое программирование» 60

*КАСПЕРОВИЧ Т.Н.* Применение компьютерных технологий при обучении математическим дисциплинам 66

*ЛОПУХ Ю.И.* Методическая разработка практического занятия по теме: «Анализ баланса банка» дисциплины «Основы анализа деятельности банка» 72

*БОРИЧЕВСКАЯ В.В.* Тактика познавательного поиска. Интерактивное обучение на занятиях права 78

*МАКАРУШКО В.В.* Личностно-ориентированное обучение как право преподавателя на самовыражение 82

*ФАДЕЕВ В.В.* Психологические аспекты, способствующие формированию интересов к занятиям физической культурой. Новые подходы в оценке… 85

## II ПРИЕМЫ ВОСПИТАНИЯ: ФОРМЫ И МЕТОДЫ


*КУДЕЛИЧ Е.В., СЕМЕНЯКА О.Н.* Ценностные ориентации студентов колледжа 94

*СЕМЕНЯКА О.Н.* Динамика профессионального самосознания студентов в процессе обучения в Пинском государственном высшем банковском колледже по специальности «Экономист» 100

*ЛИРА В.В.* Привитие учащимся и студентам колледжа основополагающих ценностей, идей, убеждений, формирование активной гражданской позиции в становлении человека как личности 104

*ЗУБКО О.В.* Ненасильственные методы разрешения межличностных конфликтов 111

*МІСЮКАВЕЦ Л.П.* Метадычная распрацоўка літаратурна-краязнаўчага вечара "Смерці ў паэта няма — ёсць нараджэнне" 118

*МИХОЛАП М.Н., БОРИСОВА Ж.А.* Формирование эстетической культуры учащихся и студентов 130

*НОВИК Т.В.* Методическая разработка воспитательного часа «Татьянин день» 142

*ЧЕРНОРУК С.В.* Разработка открытого кураторского часа по теме «Незагойнаю ранай мне Чарнобыль баліць» 145

*СИНКЕВИЧ А.И.* Формы воспитательной работы в колледже 159